# АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў ПАМЕШЧЫЦКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ: МАТЫВАЦЫЯ І КАНТРОЛЬ

**Шыдлоўскі Сяргей Алегавіч**
дацэнт кафедры гісторыі і турызму ўстановы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*У артыкуле разглядаюцца традыцыі арганізацыі працы ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Аналізуюцца практыкі фарміравання сістэмы працоўнай матывацыі і кантролю як ў дачыненні прыгоннага сялянства, так і платных работнікаў. Выяўляюцца агульныя недахопы ў рэалізацыі дадзеных кіраўніцкіх функцый.*

Працоўная матывацыя і кантроль за работай персаналу ў тэорыі менеджменту XIX – пачатку XX ст. прызнаюцца неабходнымі элементамі любой эфектыўнай сістэме кіравання [6, с. 12]. Падобныя высновы сустракаюцца ўжо на старонках трактату «Земляробства» («De Agri Cultura», 160 год да н. э.) антычнага аўтара М.П. Катона [5, с. 8−9, 11−12]. Разуменне дадзенай праблематыкі прысутнічала на працягу разглядаемага перыяду і ў памешчыцкіх колах Беларусі.

Слабая матывацыя ў працы прыгонных сялян усведамлялася дваранамі-памешчыкамі як сур'ёзны выклік. Так, паводле слоў Я. Тышкевіча, сяляне Барысаўскага павету «лянівыя, нядбалыя з уласнасцю сваёй і несумленныя – з чужой» [13, s. 115]. К. Тышкевіч развівае дадзеную характарыстыку: мясцовае сялянства «абыякавае, лянівае і скрытнае» [14, s. 45]. Паводле слоў К. Кантрыма, выкарыстанне ўласных прыгонных не заўжды выгодна, бо апошнія не зацікаўлены ў выніку справы і захаванні панскага дабра [11, s. 61]. М.П. Жданаў, вандруючы ў 1838 г. па Беларусі, заўважыў, што мясцовыя сяляне займаліся перавозкай лесу самым невыгодным і працаёмкім спосабам, «нібыта адмыслова катуючы сябе і свайго каня» [4, с. 175].

Адна з прычын вышэйапісанага становішча ляжала на паверхні і лёгка апазнавалася: памешчыкі прызвычаіліся лічыць працу прыгонных амаль дармавой (гродзенскі інвентарны камітэт у 50-х гг. XIX ст. ацаніў рабочы дзень прыгоннага селяніна ў 12−15 капеек для коннага і 8−10 капеек − для пешага) [2, с. 167]. Прынцып аплаты працы ператвараўся ў абстракцыю і ў выпадку наёмных работнікаў [12, s. 41]. У 1845 годзе ў Гродзенскай губерні работніку, які меў свайго каня, плацілі за рабочы дзень 40 капеек, у 1853−1858 гадах − ужо 90 капеек,



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

у 1860 годзе − 1 рубель 25 капеек. Работнік без каня ў 1845 годзе атрымліваў 20 капеек, у 1853−1858 гадах − 30−40 капеек. Рост аплаты П. Баброўскі тлумачыў недахопам працоўных рук і экстэнсіўным павелічэннем плошчаў заворвання ў памешчыцкіх фальварках. Аднак і з улікам падвышэння заробкаў беларускі селянін атрымліваў мізэрна мала ў параўнанні з еўрапейскімі расцэнкамі: так, у сярэдзіне 60-х гадоў XIX ст. у Англіі за заворванне адной дзесяціны (у сярэднім два дні працы) плацілі 10 рублёў [3, с. 8−9].

Мясцовае насельніцтва мела прыработкі пры рубцы і сплаве лесу, а таксама на гонцы смалы і дзёгцю, прыгатаванні паташу, на мачальнай, лыкавай і лубачнай вытворчасці. Аднак за часамі прыгону развіццё дадзенай вытворчасці спрыяла толькі збядненню сялян, якіх памешчыкі эксплуатавалі на дадзеных работах за мізэрную аплату [3, с. 13−16]. Для арганізацыі сплаву памешчыкі звычайна выкарыстоўвалі сваіх прыгонных, непамешчыкі − наймалі работнікаў на ўмове памесячнай аплаты. У сярэднім праца аплачвалася ў месяц 2 рублі срэбрам без уліку правіянту. Гэтыя грошы ішлі пану, а прыгонны работнік атрымліваў на рукі ў залежнасці ад разлікаў памешчыка яго чыншу, падатку і іншых павіннасцей [11, s. 36−40].

У часопісе «Русская мысль» у 1914 годзе была апісана распаўсюджаная на беларускіх землях практыка так званага «зімняга найму». Яе сутнасць заключалася ў тым, што зімой галадаючыя сяляне, каб атрымаць у памешчыка грашовы аванс у 10−15 рублёў, нaймаліся на летнія палявыя работы за аплату, якая звычайна была меншай у 2−3 разы за вясеннелетнія расцэнкі. Так, на вясну 1913 года падобныя пагадненні заключылі да 52 % сялян Магілёўскай губерні [8, с. 123].

Нават калі памешчык назначаў прыстойныя заробкі, у гаспадарцы звычайна дзейнічала разгалінаваная сістэма грашовых штрафаў. Грашовыя штрафы ў часы прыгону маглі спалучацца з цялесным пакараннем. Распаўсюджанай з'явай у маёнтках было катаванне бізунамі, якое прызначалася не толькі памешчыкам, але і эканомам [9, s. 184]. Э. Масальскі называе пакаранне ў 100 бізуноў досыць распаўсюджанай з'явай [12, s. 49]. «Цывілізаваным» спосабам змяншэння выдаткаў на аплату паслуг высокакваліфікаванага персаналу (напрыклад, гувернёры, архітэктары, садоўнікі) была гульня з імі ў карты. Ахвяры, калі даражылі сваім месцам, вымушаны былі прайграваць частку свайго жалавання гаспадарам [12, s. 65]. У падобных абставінах абкрадванне пана рабілася сістэмнай з'явай і ўсведамлялася як справядлівая форма кампенсацыі за працу. Каб зменшыць страты, памешчыкі ўдасканальвалі меры кантролю [12, s. 41].

Г. Цюндзявіцкая, аўтар «Літоўскай гаспадыні», асаблівую ўвагу звяртала менавіта на неабходнасць увядзення ў паўсядзённую гаспадарчую дзейнасць памешчыцкай гаспадаркі дакладнай сістэмы ўліку і кантролю. Кантроль меў на мэце праверку паўнаты і дакладнасці выканання работнікамі сфармуляваных гаспадаром абавязкаў. Кожны работнік мусіў мець дакладна акрэсленае кола абавязкаў. Работнікі асабіста дакладвалі аб становішчы на даручаным ім участку гаспадару. Кантроль за работнікамі ажыццяўляўся як эканомам, так і самім гаспадаром. Напрыклад, Г. Цюндзявіцкая раіла штодня патрабаваць ад пастухоў разгорнутага дакладу аб здароўі жывёлы [10, s. 31], рэкамендавала гаспадарам маёнтка двойчы на дзень, абавязкова кожны раз у розны час, рабіць агляд усіх рабочых месцаў. Летам рэкамендавалася штодня падлічваць колькасць птушкі і быдла, якое вярталася ў двор з поля. Увесь інвентар мусіў перапісвацца, пазначацца клеймамі і замацоўвацца за асобнымі работнікамі. Гаспадар павінен быў рэгулярна правяраць наяўнасць інвентару па спісе. Рэкамендавалася рэгулярна кантраляваць якасць прыгатаванай для работнікаў ежы – яе смакавыя якасці і наяўнасць усіх прадуктаў у вызначанай гаспадаром колькасці, каб прадухіліць крадзеж кухарамі [7, с. 3].

Такім чынам, у дарэформенны перыяд у дваранскім маёнтку на землях Беларусі шырокую распаўсюджанасць мелі метады пазаэканамічнага прымусу да працы ў дачыненні прыгоннага сялянства. Адносна платных работнікаў мясцовыя памешчыкі задавальняліся таннай рабочай сілай. Падобная стратэгія не спрыяла аднаўленню і развіццю вытворчых сіл у мясцовай сельскай гаспадарцы. Мізэрныя заробкі не дазвалялі селяніну абнаўляць свой гаспадарчы інвентар і цяглавую сілу, а таксама ўласныя фізічныя выдаткі, – сяляне выкарыстоўвалі знясіленую жывёлу, прымітыўны інвентар і самі адносіліся да падобнай работы нядбайна. Матывацыя і якасць працы зніжаліся. У выніку губляла і памешчыцкая гаспадарка, аднак імгненная карысць ад ашчаджання грошай на найме таннай рабочай сілы пераважвала доўгатэрміновыя разлікі. Спробы выправіць сітуацыю рэалізаваліся ў плоскасці кантролю, якія патрабавалі дадатковых выдаткаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Бобровский, П. О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. − Вильно. − 1865. − Г. IV. − Кн. III. − Ч. 3. − С. 37–64.
2. Бобровский, П. О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. − Вильно. − 1865. − Г. III. − Кн. XII. − Ч. 3. − С. 157–172.
3. Бобровский, П. О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. − Вильно. − 1865. − Г. IV. − Кн. IV. − Ч. 3. − С. 1–17.
4. Жданов, М. П. Путевые записки по России в двадцати двух губерниях / М. П. Жданов. − СПб. : В. Поляков, 1843. − 220 с.
5. Катон, М. П. Земледелие / М. П. Катон ; пер. М. Е. Сергеенко. − СПб. : Наука, 1950. − 221 с.
6. Файоль, А. Общее и промышленное управление / А. Файоль // Управление − это наука и искусство / сост. Г. Л. Подвойский. − М. : Республика, 1992. − 349 с.
7. Шыдлоўскі, С. А. Сістэма рацыянальнага гаспадарання ў рабоце Ганны Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня» / С. А. Шыдлоўскі // Вестник Полоцкого государственного университета: Серия А (гуманитарные науки). − 2013. − № 9. − С. 2–6.
8. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900–1917 годы / под ред. Г. Т. Ковалевского [и др.]. − Минск : Издательство Академии наук БССР, 1963. − 422 с.
9. Gloger, Z. Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. − Warszawa : Druk Piotra Laskauera i S-ki, 1900–1903. − T. 1. − 1900. − 316 s.
10. Gospodyni litewska czyli nauka utrzymywania porządnie domu i zaopatrzenie go we wszystkie przyprawy : zapasy kuchenne, apteczkowe i gospodarskie, tudzież hodowania i utrzymywania bydła, ptastwa i innych żywiołów, według sposobów wyprobowańszych i najdoświadczeńszych, a razem najtańszych i najprostszych. − 4 wyd. − Wilno : Nakł. i drukiem J. Zawadzkiego, 1858. − 496 s.
11. Kontrym, K. Podróż Kontryma, urzędnika banku polskiego odbyta w roku 1829 po Polesiu / K. Kontrym ; Wydana przez Edwarda Raczyńskiego. − Poznań : U Walentego Stefańskiego, 1839. − 72 s.
12. Massalski, E. T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy : romans administracijny : w 5 częściach. Część 2 / E. T. Massalski. − Wilno : W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. − 268 s.
13. Tyszkiewicz, E. Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim, z dodaniem wiadomości : o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach itd. / E. Tyszkiewicz. − Wilno : Druk. A. Marcinowskiego, 1847. − 489, IV s.
14. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. − Drezno : drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. − XVI, 362 s.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова